«**ЯЎГЕ́Н АНЕ́ГІН**», опера («лірычныя сцэны») у 3 дзеях, 7 карцінах П.*Чайкоўскага*. Напісана ў 1878. Лібрэта кампазітара і К.Шылоўскага паводле рамана ў вершах А.Пушкіна. На Беларусі выконвалася ў Мінску ў 1887 трупай рус. артыстаў пад кіраўніцтвам А.Даніловіч, у 1890—91 — трупай А.Картавава на чале з В.Сукам, у 1892 — трупай І.Шумана, у 1897—98 — Т-вам оперных артыстаў пад кіраўніцтвам Г.Ізмайлава і Г.Шэйна, у 1899—1900 і 1903 — італьян. трупай Ф.Кастэлана, у маі 1899 — Т-вам рускіх оперных артыстаў пад кіраўніцтвам А.Макарэска і Шэйна, у жніўні 1904 — трупай Г.Шумскага, у 1906 — Кааператыўным т-вам оперных сцэн. дзеячаў пад дырэкцыяй Е.Бяляева, восенню 1908 — Маскоўскай прыватнай операй С.Зіміна, вясной 1910 — Т-вам санкт-пецярбургскіх оперных артыстаў пад кіраўніцтвам М.Кірыкава і М.Цымермана. На сцэне Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі паст. ў 1933 (дырыжор І.Гітгарц, рэж. В.Барысевіч, мастак Б.Дзясніцкі, хормайстар Г.Пятроў; Анегін — М.Дзянісаў, М.Пігулеўскі, В.Каліноўскі, Ю.Дзярзаеў; Таццяна — Р.Млодак, Л.Александроўская; Ленскі — І.Балоцін, М.Русін, М.Бароўскі; Вольга — В.Пукст; Грэмін — К.Нікалаевіч, У.Таланкін); у 1936 (дырыжор М.Шнейдэрман, рэж. М.Дзіскоўскі, мастак А.Марыкс); у 1940 (дырыжор М.Балазоўскі, рэж. П.Златагораў); у 1948 (дырыжор Гітгарц, рэж. У.Шахрай, мастак Б.Волкаў; Анегін — М.Сярдобаў, М.Дзянісаў, М.Ворвулеў; Таццяна — Млодак, В.Малькова, А.Барсукова, Ц.Мільчына; Ленскі — Балоцін, В.Лапін; Вольга — Г.Цэпава; Грэмін — І.Мурамцаў, Таланкін); у 1954 (дырыжор Т.Каламійцава, рэж. А.Маралёў, мастак У.Мамантаў, хормайстар М.Прысёлкаў; Анегін — Ворвулеў, У.Глазаў, В.Ганчарэнка, А.Саўчанка, В.Кучынскі, В.Скорабагатаў; Таццяна — Т.Шымко, З.Лапчанка, Барсукова, С.Ваяводская, Н.Дзвінянінава, Н.Ткачэнка, К.Старыкава, І.Шыкунова, І.Адзінцова, Н.Губская, Л.Крывёнак; Ленскі — Г.Дзмітрыеў, С.Удавічэнка, А.Русанаў, А.Калеснічэнка, В.Кірычэнка, А.Рудкоўскі, У.Экнадыёсаў; Вольга — Р.Асіпенка, Л.Галушкіна, С.Гулевіч, І.Атлыгіна, Л.Афанасьева, В.Цішына; Грэмін — Л.Бражнік, У.Лубяной, М.Зюванаў, М.Дружына, С.Фралоў, М.Зданевіч, А.Сухін, В.Чарнабаеў), у 1986 (дырыжор М.Калядка, рэж. В.Шышоў, мастак Дз.Мохаў, хормайстар А.Кагадзееў; Анегін — М.Майсеенка, Скорабагатаў, У.Пятроў, А.Краснадубскі, А.Марозаў; Таццяна — Н.Губская, Н.Залатарова, Крывёнак, Адзінцова, Н.Каствнка, А.Бундзелева, Т.Глаголева, В.Курбацкая, Т.Цівунова; Ленскі — Э.Пелагейчанка, М.Грыгорчык, С.Драбышэўскі, І.Шупеніч, А.Тузлукоў, Ю.Слонаў; Вольга — Афанасьева, Н.Руднева, Т.Варапай, Э.Рыжановіч, А.Сало; Грэмін — В.Грашчанка, Я.Пятроў, А.Мельнікаў, А.Гардынец, А.Кеда). Апошняя версія спектакля працягвае ўстойлівыя традыцыі рус. рэаліст. сцэны, узнаўляючы, па меры магчымасці, натуральны інтэр'ер і экстэр'ер разгортвання падзей оперы. *А.В.Лісава.*

**ЯЎРА́ЕЎ** Рувім Янкелевіч (13.9.1914, г. Марыупаль, Украіна — 5.8.1987), артыст оперы (барытон). Засл. арт. Беларусі (1964). Вучыўся ў Бел. кансерваторыі (1937—41), скончыў Саратаўскую кансерваторыю (1943). У 1945—70 саліст, з 1963 адначасова асістэнт рэжысёра Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі. Валодаў прыгожым, рухомым голасам вял. дыяпазону. Найб. ярка талент Я. выявіўся ў партыях камічных персанажаў. Сярод створаных ім вобразаў: яфрэйтар Ліпке, Марэк («Дзяўчына з Палесся», «Алеся» Я.Цікоцкага), Якуб («Надзея Дурава» А.Багатырова), Сцяпан («Яснае світанне» А.Туранкова), Ротны, Зарэцкі («Яўген Анегін» П.Чайкоўскага), Скула («Князь Ігар» А.Барадзіна), Бартала («Севільскі цырульнік» Дж.Расіні), Нілаканта («Лакме» Л.Дэліба) і інш. *Дз.М.Жураўлёў.*

**ЯЎРЭ́Й**, персанаж народнага тэатра. У розных мясцовасцях Беларусі меў розныя імёны: Ёсель, Бэрка і інш. Найчасцей сустракаецца ў калядным гурце (як калядны персанаж не сустракаецца ў Зах. Паазер'і), батлеечным тэатры і нар. драме. Больш за ўсё сустракаецца ў батлейцы. Як і *Цыган*, ён адзін з самых яркіх камедыйных вобразаў. Займаўся гандлем, з ім звязаны карнавальны матыў п'янства (карчмар). Выступаў і як чарнакніжнік, часам як купец з таварам. На Навагрудчыне бытавала сцэна «Яўрэй і Антон з казой», дзе Я. вёў торг з мужыком з-за казы. У жывой батлейцы (нар. драма «Цар Ірад») сцэны з Я. — тыпова батлеечныя. Найб. поўныя і яркія ў запісе М.Федароўскага (мяст. Дзятлава Слонімскага пав.): выступае як чарнакніжнік, купец з таварам «з Еразалімы», ёсць і вялікая сцэна «ўсталявання на троне». У нар. драме сцэны з Я. фактычна не адрозніваюцца ад батлеечных. Блазнерскае прызначэнне персанажа найб. яскрава пададзена ў запісе Е.Раманава (Беліцы Магілёўскай губ.). Я. выступаў у ім як своеасаблівы каментатар падзей і ўчынкаў дзеючых асоб. Амаль пасля кожнай фразы т.зв. сур'ёзнага персанажа ён падае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

свае рэплікі, адпускае кпіны, усё абсмейвае. Я. выконвае важную ролю карнавальнага развенчвання: у «Цары Ірадзе» мёртвага караля, у «Цары Максіміляне» — жывога. У некат. батлеечнікаў сцэна з Я. была лаканічная (батлейка А.Моніча). У палескай батлейцы (Мазыр, Рэчыца, Парычы) вобраз меў больш глыбокую сац. характарыстыку. Сцэны з батлейкі, дзе Я. выступае ў ролі карчмара, пачынаюцца з яго прамоў і заканчваюцца танцам з жонкаю Сорай. У варыянтах батлейкі, запісаных Е.Раманавым і М.Федароўскім каля Ваўкавыска, Я. выступае як сац. абвінаваўца цара Ірада: «А ты з нас браў, а ты з нас драў: // Маставое, брукавое. / А пагалоўшчына, а батраччына, / А драў, а браў, / каб на табе чорт скурачка драў...» У нар. драмах «Трон» (зап. на Лебядзінскай цукраварні М.Васільевым, 1889), «Лодка» (зап. ў Рэчыцкім пав. А.Грузінскім, 1896) Я. выступае як яркі камедыйны персанаж. Вобраз Я. ствараецца ў адпаведнасці з традыцыямі бел. нар. тэатра: ён гаворыць па-беларуску, выступае ў ролі своеасаблівага блазна, смяшыць гледачоў тым, што перакручвае рэплікі інш. персанажаў. Амаль увесь час знаходзіцца на сцэне, але ў дыялогі з інш. героямі ўступае рэдка. У варыянце, запісаным у Рэчыцкім пав., Я. выступае ў ролі краўца і вядзе са Старым і Доктарам жартоўныя дыялогі. Сустракаецца ў батлейках, запісаных Федароўскім на Беласточчыне. Смяшыць Я. і сваім знешнім выглядам: доўгія лахматыя валасы (пэйсы), пантофлі, якія спадаюць з ног, часам быў і атрыбут блазна — горб (Слуцкая батлейка, батлея Федароўскага). Дадатковы камічны эфект — мова Я. з акцэнтам.

*Літ.*: Саламевіч Я. Міхал Федароўскі. Мн., 1972; Народны тэатр. Мн., 1983.

*І.А.Алексніна, Дз.У.Стэльмах.*



*А.В.* ***Яфрэмаў****.*

**ЯФРЭ́МАЎ** Аляксандр Васілевіч (н. 1.5.1951, с. Салган Ніжагародскай вобл., Расія), тэатральны і кінарэжысёр. Засл. дз. маст. Беларусі (1999). Скончыў Усесаюзны дзярж. ін-т кінематаграфіі (1976). З 1976 працуе на кінастудыі «Беларусьфільм». Адначасова з 1990 выкладае ў Бел. АМ (з 2001 праф.). З 1991 маст. кіраўнік Тэатра-студыі кінаакцёра. Паставіў спектаклі: «Міленькі ты мой» М.Варфаламеева (1994, разам з У.Гасцюхіным, таксама і мастак), «Айседора. Танец кахання» паводле п'есы З.Сагалава «Тры жыцці Айседоры Дункан» і кнігі Дункан «Мая споведзь» (1995), «Таленты і паклоннікі» А.Астроўскага (1996), «Філумена Мартурана» Э. Дэ Філіпа (1999), «Пігмаліён» Б.Шоу (2002). Творчую манеру Я. вызначае паглыблены псіхалагізм, дакладная распрацоўка сцэнічных характараў, беражлівае стаўленне да драматургічнай асновы, адчуванне рытму, стылю, аўтарскага светаўспрымання. Здымае маст., дакументальныя і відэафільмы. *А.В.Усцінава.*



*А.* ***Яфрэменка*** *ў ролі Дона Луіса.*

**ЯФРЭ́МЕНКА** Аляксей Антонавіч (17.3.1910, в. Грыбы Краснапольскага р-на — 27.11.1977), акцёр. Засл. арт. Беларусі (1967). Творчую дзейнасць пачаў у 1935 у Барысаўскім траме. Працаваў у калгасна-саўгасных Барысаўскім (1935—38) і Заслаўскім (1938—39), абл. драм. Пінскім (1939—41, 1946—54) і Магілёўскім (з 1954) т-рах. Акцёр вострахарактарнага бытавога плана. Створаныя ім сцэнічныя вобразы вызначаліся яркасцю сац. характарыстык, сакавітым нар. гумарам, трапнымі дэталямі, жыццёвай верагоднасцю і адметнасцю. Узнаўляючы ўнутранае жыццё персанажа, імкнуўся да апраўданасці прапанаваных аўтарам абставін, што спалучалася з пластычнай выразнасцю знешняга малюнка ролі. Дакладна падбіраў асабісты рэквізіт персанажа, знаходзіў належную для яго экіпіроўку. Сярод лепшых роляў: Батура («Партызаны»

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ